# НАВУКОВАЯ ТРАДЫЦЫЯ Ў СВЯТЛЕ ФІЛАСОФСКАГА І КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ: СПРОБА МЕТАДАЛАГІЧНАЙ РЭФЛЕКСІІ

**Бабко А.І.**

*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін “традыцыя” можа падацца не зусім адэкватным і крыху недарэчным пры ўжыванні яго для апісання дынамікі навукі – феномена, для якога характэрна найперш інавацыйнасць і адкрытасць да прышласці. Тым не менш філасофска-рэфлексіўны аналіз гісторыі навуковага пазнання і сучасных навукова-даследчых практык сведчыць на карысць такога ўжывання. (І яно мае месца ў адпаведных тэкстах. Каб прывесці прыклад, працытуем артыкул Стэнфардскай філасофскай энцыклапедыі, прысвечаны суадносінам тэорыі і назіранняў у галіне навукі: “Даследчыкі, якія належаць да розных традыцый навуковага пошуку, – у адпаведнасці са сваёй падрыхтоўкай – могуць паведамляць пра вынікі праведзеных імі назіранняў у кантэксце аперацыяналізацый, што знаходзяцца ў канфлікце адна з адной” [1]. – Тут і далей пераклад мой – А.Б.).

Варта адзначыць невыпадковы характар такога стану рэчаў: ён абумоўлены ўласцівым гістарычнай дынаміцы навукі момантам пераемнасці, бесперапыннасці, паслядоўнасці (што зусім не азначае, аднак, адсутнасці ў ёй радыкальных, рэвалюцыйных пераўтварэнняў; наадварот, гэтыя два тыпы развіцця навуковага пазнання ўзаемаабумоўліваюць і ўзаемадапаўняюць адзін аднаго). Праўда, наяўнасць у разгортванні навуковага пошуку згаданага моманту аспрэчваецца прадстаўнікамі пэўных філасофскіх і навуказнаўчых кірункаў – згадаем, напрыклад, “антыкумулятывісцкую” канцэпцыю Т. Куна. Аднак нават у бескампраміснай кунаўскай пазіцыі, дзе катэгарычна адмаўляецца глабальная пераемнасць і бесперапыннасць гістарычнай дынамікі навукі, прызнаецца фактычна пераемнасць лакальная: яна здзяйсняецца на грунце пэўнай парадыгмы, яе функцыянавання і ўдасканалення, г. зн. у перыяд “нармальнай навукі” (варта адзначыць, што амерыканскі філосаф актыўна ўжывае тэрмін “традыцыя” ў дачыненні да гэтага перыяду [5, с. 40, 45, 112]). Такім чынам, парадыгматычная тэорыя задае ўласную навуковую традыцыю (на думку Т. Куна, не звязаную, праўда, са сваімі папярэднiцамі і наступніцамі).

Навука выступае як значны і важны (асабліва ў сучасных умовах) сегмент культуры, звязаны разнастайнымі дачыненнямі з іншымі культурнымі феноменамі. Таму навуковая традыцыя ўяўляе сабой прыватны выпадак культурнай традыцыі і можа даследавацца пры дапамозе назапашаных філасофіяй культуры і культуралогіяй у працэсе вывучэння традыцыйнага аспекту культурнага жыцця пазнавальных стратэгій і метадычных інструментаў. Асабліва значны патэнцыял выяўляе ў гэтым плане

філасофская герменеўтыка, у рамках якой моманту традыцыйнасці ў развіцці культуры надаецца істотнае значэнне і здзяйсняецца яго грунтоўнае вывучэнне.

Магчымасць задзейнічаць герменеўтычную метадалогію ў працэсе аналізу характэрных для навукі пазнавальных практык і рэфлексіўнай рэканструкцыі іх падстаў выглядае надзвычай прывабна. Справа ў тым, што філасофская герменеўтыка прэзентуецца як абаронца інтарэсаў гуманітарных навук, іх адметнасці, іх неад’емнага права на суверэннае, незалежнае існаванне. Таму яна падаецца, як правіла, тэарэтычнай плыняй, якая характарызуецца моцнымі тэндэнцыямі да самаізаляцыі і сепаратызму ў дачыненні да прыродазнаўчага пазнання і тых філасофскіх кірункаў, што на яго арыентуюцца і найперш на ім засяроджваюць сваю ўвагу. У сувязі з гэтым яе прадстаўнікі падкрэслівалі, зрэшты, і спецыфіку прыродазнаўства, імкнучыся разам з тым, натуральна, пераадолець яго вяршэнства ў пазнавальнай дзейнасці [3, с. 1–2, 460]. (Праўда, у яе абсягу распрацоўваецца і ідэя, блізкая да пазітывісцкага ўяўлення пра грунтоўнае адзінства навукі. У якасці асновы такога адзінства разглядаюцца, безумоўна, не кагнітыўныя стандарты, характэрныя для прыродазнаўства, а якраз ідэі, на якіх грунтуюцца герменеўтычныя тэорыя і практыка, неабавязкова звязаныя, аднак, выключна з гуманітарным пазнаннем: маюць месца, напрыклад, спробы задзейнічаць “рамесна-тэхнічныя парадыгмы разумення … як узор герменеўтычных канцэпцый” [4, с. 127]). Ужыванне герменеўтычнай метадалогіі ў кантэксце вывучэння навуковых традыцый можа істотным чынам паспрыяць аслабленню і пераадоленню “раскольніцкіх” тэндэнцый ў гэтай філасофскай плыні. У сувязі з гэтым паўстае, відавочна, і магчымасць для разгортвання плённага дыялогу і ўзаемнага ўзбагачэння розных філасофска-метадалагічных кірункаў.

Надзвычай спрыяльнай для гэтых дыялагічных стасункаў з’яўляецца наяўнасць пэўнай блізкасці, пэўных аналогій і кропак судакранання паміж узаемадзейнымі плынямі. Падобная сітуацыя мае месца і пры спробе задзейнічаць герменеўтычную метадалогію ў працэсе філасофскага і культуралагічнага аналізу навуковых традыцый. У выніку такой аплікацыі герменеўтычнага падыходу выяўляюцца істотныя паралелі паміж ім і згаданай вышэй, шмат у якіх адносінах спрэчнай і “правакацыйнай” канцэпцыяй гістарычнага развіцця навукі, распрацаванай Т. Кунам. (Пры гэтым герменеўтыка можа выступіць у якасці метадалагічнай падставы для адэкватнай і эфектыўнай рэакцыі на праблематычныя кунаўскія ідэі.) Сапраўды, калі філосаф даводзіць пра прадузятасць светабачання навукоўцаў, абумоўленую іх прыхільнасцю да пэўнай парадыгматычнай тэорыі [5, с. 111–112], дык гэта нагадвае герменеўтычную тэзу пра папярэднія, прадузятыя меркаванні як фундаментальную характарыстыку разумення [3, с. 275–276; 7, с. 1260].

Сіла і аўтарытэт навукі грунтуюцца на істотнай, глыбокай сувязі распрацаваных у яе абсягу тэорый з досведам, яе развіццё – на складаным, напоўненым калізіямі, праблемамі і супярэчнасцямі ўзаемадзеянні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(мета)тэарэтычнага і эмпірычнага ўзроўняў даследчай дзейнасці. Пры гэтым асноўнай прычынай поспеху той ці іншай навуковай тэорыі з’яўляецца яе (найбольшая ў параўнанні з іншымі тэарэтычнымі пабудовамі) адэкватнасць назапашаным на дадзены момант эмпірычным ведам. Такі погляд на сутнасць навуковага пазнання прымаецца большасцю філосафаў, тэарэтыкаў навуказнаўства і навукоўцаў. Т. Кун, аднак, лічыў яго не надта слушным і неадпаведным сапраўднаму стану рэчаў. Ён акцэнтаваў месца, ролю і значэнне пазанавуковых фактараў гістарычнай дынамікі навукі (у прадмове да сваёй знакамітай кніжкі “Структура навуковых рэвалюцый” філосаф выказвае шкадаванне, што ў ёй недастаткова поўна прааналізаваны ўплыў знешніх умоў навукова-даследчай дзейнасці, які можа мець для яе фундаментальныя наступствы – напрыклад, паспрыяць ператварэнню анамаліі, г. зн. сур’ёзнай праблемы, у крыніцу глыбокага пазнавальнага крызісу [5]). Перамога пэўнай парадыгматычнай тэорыі абумоўліваецца не тым, што яна найлепш стасуецца з вынікамі эксперыментаў і назіранняў, а яе найвышэйшай канкурэнтназдольнасцю ў дадзеных сацыякультурных умовах (філосаф праводзіў аналогію паміж развіццём навуковага пазнання і біялагічнай эвалюцыяй у дарвінаўскай версіі яе інтэрпрэтацыі: абодва працэсы разгортваюцца на аснове селектыўных механізмаў [5, с. 172–173]).

Прадвызначанасць навукова-даследчых практык парадыгматычнымі прыхільнасцямі іх суб’ектаў робіцца ў Т.С. Куна абсалютнай, фатальнай. Плённы, рацыянальны дыялог паміж прадстаўнікамі розных (мета)тэарэтычных падыходаў (а таму і паміж адпаведнымі навуковымі традыцыямі), на яго думку, проста немагчымы. Вынікі эмпірычных даследаванняў не могуць істотна паўплываць на характар іх узаемадачыненняў, бо яны па-рознаму бачацца ў святле розных парадыгмаў і запачаткаваных імі традыцый.

Аднак аналіз практыкі навуковых даследаванняў паказвае, што ўплыў грунтоўных тэорый на навукоўцаў, якія іх прытрымліваюцца, не з’яўляецца ні непазбежным, ні непапраўным [1]. У пэўных выпадках навукоўцы здольныя карэктаваць свае зыходныя (мета)тэарэтычныя пазіцыі. Гэта азначае, што яны могуць быць адкрытымі і ў дачыненні да аргументаў, што грунтуюцца на досведзе, і да тэарэтычных контраргументаў, што выказваюцца іх апанентамі. У дадзеным кантэксце і выяўляецца згаданае вышэй істотнае – тэарэтычнае і метадалагічна-аперацыянальнае – значэнне герменеўтыкі як падставы для дзейснага супрацьстаяння тым кунаўскім ідэям, што могуць фігураваць у якасці перашкоды на шляху рацыянальнага дыялогу, да якога заклікаў К. Попер [6, с. 6–7]. Згодна з герменеўтычнымі прынцыпамі кожны чалавек павінен усведамляць нясталы, нявыспелы характар сваіх папярэдніх меркаванняў і мэтанакіравана працаваць з імі, выпраўляючы ці, наогул, адмаўляючыся ад іх, калі яны не вытрымліваюць праверку на адпаведнасць сутнасці справы. (Г.-Г. Гадамер піша ў дадзенай сувязі, што той, хто разумее, засяроджваецца таксама і на перадумовах свайго разумення. Аднак “гэта не ўзаконьвае прыватнае і адвольнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суб’ектыўнай прадузятасці, бо справа, пра якую ідзе гаворка, поўнасцю захоўвае сваё дысцыплінавальнае значэнне” [2, с. 1070].)

У канчатковым выніку такая пазіцыя грунтуецца на ўяўленні пра гістарычную абумоўленасць чалавечага быцця ў свеце і гістарычную абмежаванасць чалавечага далягляду. Відавочна, што ў дачыненні да філасофскага і культуралагічнага аналізу навуковага пазнання (і ў самім яго абсягу) яна можа істотна паспрыяць пераадоленню ўяўлення пра дагматычную закрытасць навуковых традыцый і разгортванню плённага дыялога паміж імі. Іх прадстаўнікам (у тым ліку і ў галіне прыродазнаўства) герменеўтычная метадалогія дае дзейсныя сродкі, якія дазваляюць пазбегнуць абсалютызацыі асноватворных ідэй тых тэорый (і традыцый), у рамках якіх яны былі падрыхтаваны да навукова-даследчай дзейнасці, і вызваліцца ад іх непамернага светапогляднага і семантычнага ціску.

Такім чынам, ідэі і прынцыпы, распрацаваныя ў абсягу розных філасофска-метадалагічных праектаў выяўляюцца ў кантэксце вывучэння навуковых традыцый як запатрабаваныя, рэлевантныя і – што надзвычай важна – як здольныя да плённага ўзаемадзеяння, да ўзаемнага ўзбагачэння. У выніку іх дыялога значна больш надзейным і featureнабаковым робіцца метадалагічны падмурак як філасофскіх і культуралагічных даследаванняў згаданага феномена, так і саміх навукова-даследчых практык (г. зн. яго самога). Яскравы прыклад плённага ўзаемадзеяння філасофска-метадалагічных кірункаў у згаданым кантэксце ўяўляюць сабой дачыненні філасофскай герменеўтыкі і антыкумулятывісцкай канцэпцыі гістарычнага развіцця навукі, распрацаванай Т. Кунам. Калі апошняя папярэджвае навукоўцаў пра небяспеку дагматызацыі (мета)тэарэтычных падстаў іх даследчай дзейнасці, дык герменеўтычныя ідэі і прынцыпы ўзбройваюць іх сродкамі, што дазваляюць дзейсна супрацьстаяць ёй. У выніку згаданыя філасофска-метадалагічныя праекты спрыяюць перамозе ўяўлення пра адкрыты характар навуковых традыцый і разгортванню іх раўнапраўнага, рацыянальнага дыялога.

1. *Bogen, J.* Theory and Observation in Science, The Stanford Encyclopedia of Philosophy (Spring 2013 Edition), Edvard N. Zalta (ed.), URL = http://plato.stanford.edu/archivs/ spr2013/entries/science-theory-observation/

2. *Gadamer, H.-G.* Hermeneutik / H.-G. Gadamer // Historisches Wörterbuch der Philosophie: in 13 Bänden / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1971–2007. – B. 3. – S. 1062–1073.

3. *Gadamer, H.-G.* Hermeneutik: Wahrheit und Methode / H.-G. Gadamer // Gesammelte Werke. – Tübingen: J.C.B. Mohr (Paul Siebeck), 1990. – B. 1: Grundzüge einer philosophischen Hermeneutik. – 495 s.

4. *Geldsetzer, L.* Hermeneutik / L. Geldsetzer // Handlexikon zur Wissenschaftstheorie / hrsg. von H. Seiffert und G. Radnitzky. – München: Ehrenwirt, 1989. – S. 127–139.

5. *Kuhn, T.S.* The Structure of Scientific Revolutions / T.S. Kuhn. – 2-nd ed. – Chicago, London : The University of Chicago Press, 1970. – XII, 210 p.

6. *Popper, K.R.* On the Non-existence of Scientific Method / K.R. Popper // Realism and the Aim of Science, from the “Postscript to the Logic of Scientific Discovery” / ed. by W. W. Bartley, III. – London and New York : Routledge, 1999. – P. 5–8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Reisinger, K.* Vorurteil / K. Reisinger, O. R. Scholz // Historisches Wörterbuch der Philosophie: in 13 Bänden / hrsg. von J. Ritter, K. Gründer, G. Gabriel. – Basel : Schwabe Verlag, 1971-2007. – B. 11. – S. 1250–1263.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ